помогают расширять и углублять знания, полученные на уроках. Ученики овладевают умениями применять на практике знания из разных предметов в комплексе, постигая неразрывное единство природной среды и человека.

На учебной тропе обучение и воспитание сливаются в единый процесс. Школьники усваивают не только научные знания о природной среде, но и этические и правовые нормы, связанные с природопользованием. Все знания, навыки, умения, чувства, убеждения, которые формируются в ходе занятий на экотропе, направлены на решение одной из самых гуманных задач нашего времени – оптимизации отношений человека с природной средой.

### Список использованных источников


1. Мазалова, М. А. Учебная экологическая тропа как технология экологического образования младших школьников / М. А. Мазалова // Биоразнообразие и антропогенная трансформация природных экосистем : мат-лы Всероссийской науч.-практ. конф., посв. пам. проф. А.И. Золотухина. – Саратов, 2017. – С. 117–119.
2. Науменко, Н. В. Инновационные методы на уроках географии и во внеклассной работе / Н. В. Науменко, Э. В. Какарека. – Минск, 2016. – 127 с.
3. Андреева, В. Н. Предметная неделя географии в школе / В. Н. Андреева. – Минск, 2004. – 188 с.
4. Дереклеева, Н. И. Направления работы классного руководителя / Н. И. Дереклеева. Минск, 1999. – 158 с.
5. Орехова, Т. Г. Создание экологической тропы на пришкольном участке / Т. Г. Орехова, Г. П. Денисова // Начальная школа. – 2013. – № 6. – С. 61–62.
6. Калашникова, А. И. Особенности создания экологической тропы как средства формирования экологической культуры младших школьников / А. И. Калашникова // Подготовка учителя начальных классов: проблемы и перспективы: мат-лы V Междунар. науч.-практ. конф., 5 дек. 2018 г.; редкол. Н.В. Жданович [и др.]. – Минск : БГПУ, 2019. – С. 271–275.


УДК 373.31

# РАЗВІЦЦЁ МАСТАЦКА-ТВОРЧЫХ ЗДОЛЬНАСЦЯЎ ВУЧНЯЎ ПАЧАТКОВЫХ КЛАСАЎ З ВЫКАРЫСТАННЕМ ТВОРЧЫХ ЗАЙМАЛЬНЫХ ЗАДАННЯЎ НА ЎРОКАХ ЛІТАРАТУРНАГА ЧЫТАННЯ

**Г. М. Канцавая**
*УА «Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. С. Пушкіна», г. Брэст, Беларусь, e-mail: kgm7@tut.by*

Разглядаюцца прыёмы, выкарыстанне якіх на ўроках літаратурнага чытання накіравана на актывізацыю творчага ўспрымання мастацкага твора і развіццё мастацка-творчых здольнасцяў малодшых школьнікаў

*Ключавыя словы:* літаратурнае чытанне, творчыя здольнасці, творчыя займальныя заданні.

Абавязковым кампанентам сістэмы пачатковай літаратурнай адукацыі з'яўляецца творчая дзейнасць малодшых школьнікаў, у якой рэалізуюцца іх уласныя мастацкія адносіны да прачытанага.

На ўроках літаратурнага чытання для развіцця творчых здольнасцяў малодшых школьнікаў выкарыстоўваецца метад творчага чытання, які спрыяе «развіццю назіральнасці, умення бачыць і чуць з'явы жыцця, знайсці ўдалыя словы і выразы для перадачы сваіх уражанняў, шляхам выканання рознага роду творчых заданняў» [1]. Гэты метад вельмі багаты на цікавыя прыёмы, якія не толькі развіваюць творчыя здольнасці школьнікаў, але і фарміруюць чытацкія якасці, абуджаючы ў вучняў суперажыванне. Творчае ўспрыманне мастацкага твора актывізуецца праз выразнае чытанне, чытанне па ролях, каменціраванае чытанне, пераказ, ілюстраванне твора, слоўнае маляванне, працу з дэфармаваным тэкстам, дадумванне канца казкі або складанне казкі, інсцэніраванне эпізоду твора і г. д.

Адным з прыёмаў развіцця ў малодшых школьнікаў творчых здольнасцяў з'яўляецца складанне загадак. Праца з загадкамі адыгрывае вялікую ролю ў развіцці дзіцячага ўяўлення, кемлівасці і лагічнага мыслення. Адгадваючы або складаючы загадкі, малодшыя школьнікі вучацца не толькі вызначаць прыметы або дзеянні пэўнага прадмета, але і карыстацца вобразнай мовай. Паступова вучні знаёмяцца з паняццем загадка, правіламі адгадвання загадак і вучацца самастойна адгадваць загадкі; складаюць свае загадкі, у якіх называюць прыметы (колер, памер, форма) прадмета або параўноўваюць яго з іншым прадметам, паказваючы, чым ён ад яго адрозніваецца. Малодшыя школьнікі, пазнаёміўшыся з будовай загадак (загадкі ў форме апавядальнага або пытальнага сказаў, рыфмаваныя загадкі, загадкі-дыялогі), з цікавасцю складаюць загадкі, вучацца распазнаваць своеасаблівыя прыметы прадметаў, выяўляць іх адметныя асаблівасці. Яны знаёмяцца з моўнымі асаблівасцямі загадак, асноўнымі тэматычнымі групамі (пра чалавека, пра прыродныя з'явы, пра жывёл, пра птушак і г. д.), з «метафарычнымі» загадкамі, «загадкамі-задачамі», «жартоўнымі» загадкамі, «загадкамі-лічылкамі».

На ўроках літаратурнага чытання дзеці вучацца не проста адгадваць і складаць загадкі, а ад класа да класа развіваюць мастацка-творчыя здольнасці, пашыраюць свой слоўнікавы склад.

Адзін з эфектыўных прыёмаў для развіцця творчых здольнасцяў вучняў – складанне казак, апавяданняў. В. А. Сухамлінскі адзначаў, што «праз казку, фантазію, гульню, праз непаўторную дзіцячую творчасць – верная дарога да сэрца дзіцяці. Казка, фантазія – гэта ключык, з дапамогай якога можна адкрыць гэтыя вытокі, і яны заб'юць жыватворнымі ключамі...» [2, с. 29].

Пры развіцці творчых здольнасцяў вучняў пачатковых класаў, звязаных са складаннем казак, апавяданняў, настаўнікі звычайна паступова далучаюць дзяцей да ролі апавядальнікаў, казачнікаў. І гэта можна ўбачыць на прыкладзе заданняў, якія даюцца ў падручніках па літаратурным чытанні [3]: прыдумайце працяг твора (пасля знаёмства з творам А. Кобец-Філімонавай

«Кропелька» і Р. Ігнаценкі «Чырвоныя гронкі рабіны»); прыдумайце сюжэт для рэкламнага роліка пра неабходнасць садзіць дрэвы (пасля знаёмства з творам Ф. Рамашкі «Званочкі на рабіне»); намалюйце словамі, якой вы ўяўляеце восень (пасля знаёмства з творам М. Даніленкі «Па лясах і палях»); намалюйце слоўныя карціны да тэксту (пасля знаёмства з творам У. Ягоўдзіка «Восень на парозе»); складзіце свой працяг твора (пасля знаёмства з апавяданнем Ф. Рамашкі «Слёзы лілеі»); прыдумайце і раскажыце казку «Сапраўдныя сябры» (пасля знаёмства з вершам Я. Журбы «Мядзведзь»); складзіце казку, як Вясняна прыйшла на нашу зямлю (пасля знаёмства з вершам Я. Крупенькі «Вясняна») і інш.

На ўроках літаратурнага чытання шырока выкарыстоўваецца прыём выяўленчай творчай дзейнасці. Гэты прыём багаты на разнастайныя формы працы: падпісванне малюнка словамі з верша (пры вывучэнні вершаў А. Грачанікава «Беларускія краявіды» і П. Пранузы «Бывай, лета!»); разглядванне і абмеркаванне карцін С. Жукоўскага «Восень у сядзібе», К. Качана «Позняй восенню», М. Багданава-Бельскага «Дзеці ў хаце», І. Шышкіна «Жыта» і інш.; стварэнне малюнкаў зімовага пейзажу (пасля вывучэння верша Н. Галіноўскай «Размова сняжынак»). Можна таксама прапанаваць вучням пасля знаёмства з вершам І. Муравейкі «Колеры года» стварыць малюнкі да кожнай часткі верша ці намаляваць эпізод, які больш за ўсё спадабаўся, пасля знаёмства з апавяданнем А. Кобец-Філімонавай «Кропелька». Настаўнік можа прапанаваць вучням, напрыклад, праілюстраваць самы запамінальны эпізод твора, падпісаўшы яго цытатай, пасля знаёмства з творам Ф. Рамашкі «Званочкі на рабіне».

У сістэме займальных творчых заданняў асаблівае месца займаюць гульні са словамі. Напрыклад, гульня «Чароўнае слова», дзе вучням прапануецца да пэўнага слова падабраць іншыя словы, а затым з імі скласці звязны тэкст.

Спрыяе развіццю творчых здольнасцяў і гульня «Адгадай». Вучням раздаюцца карткі са словамі. І яны павінны на працягу адной хвіліны расказаць пра свой прадмет так, каб усе зразумелі, пра якое слова ідзе гаворка, пры гэтым школьнік не павінен называць сваё слова і жэстыкуляваць рукамі.

Для вучняў пачатковых класаў можна прапанаваць і гульню «Блытаніна», у ходзе якой малодшыя школьнікі з запісаных на асобных картках слоў прыказак, скорагаворак або дзіцячых песень павінны вылучыць тыя, якія складуць знаёмую прыказку, скорагаворку або дзіцячую песню.

Такім чынам, фарміраванне ведаў, уменняў і навыкаў па літаратурным чытанні можна і трэба праводзіць з выкарыстаннем творчых займальных заданняў, якія спрыяюць развіццю мастацка-творчых здольнасцяў вучняў, развіваючы логіку мыслення, уяўленне і фантазію малодшых школьнікаў, пашыраючы іх кругагляд і ўяўленні пра навакольны свет.

## Спіс выкарыстаных крыніц


1. Кудряшев, Н. И. Взаимосвязь методов обучения на уроках литературы : пособие / Н. И. Кудряшев. – М. : Просвещение, 1981. – 190 с.

2. Сухомлинский, В. А. Сердце отдаю детям / В. А. Сухомлинский. – Минск, Нар. асвета, 1981. – 287 с.
3. Антонава, Н. У. Літаратурнае чытанне : вуч. дапаможнік для 2 кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з рус. мовай навуч. : у 2 ч. / Н. У. Антонава, І. А. Буторына, Г. А. Галяш. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2021. – Ч. 1–2.

УДК 372.878

# ОСОБЕННОСТИ ИСПОЛЬЗОВАНИЯ РАБОЧИХ ТЕТРАДЕЙ ПО УЧЕБНОМУ ПРЕДМЕТУ «МУЗЫКА» ДЛЯ 1 И 2 КЛАССА

**В. В. Ковалив**
*УО «Белорусский государственный педагогический университет имени Максима Танка», г. Минск, Беларусь, e-mail: kovaliv@rambler.ru*

**А. Ю. Ковалив**
*ГУО «Средняя школа № 93 г. Минска», г. Минск, Беларусь, e-mail: alla_kovaliv@mail.ru*

Статья посвящена особенностям использования рабочих тетрадей по учебному предмету «Музыка» для 1 и 2 класса (авторов Ковалив В. В. и Ковалив А. Ю.).

*Ключевые слова:* рабочая тетрадь, музыка, начальная школа, младшие школьники.

Отличительными особенностями успешного обучения являются интерес к новым знаниям, мотивация, отличное освоение учебного материала, обретение новых умений и навыков. Замечательно, когда всё это присутствует в учебном процессе начальной школы. Хорошим подспорьем в этом деле может стать рабочая тетрадь по учебному предмету. Их использование является одним из современных способов ведения учебного процесса в школе, позволяя, в частности, передать необходимую (дополнительную) информацию, сделать процесс обучения более лёгким и интересным, рассмотреть изучаемые объекты в целом и по частям, развивать умение наблюдать и мыслить, использовать различные виды познавательной деятельности.

В настоящее время значимой частью учебно-методического комплекса по учебному предмету «Музыка» стала рабочая тетрадь. В последние годы рабочие тетради по музыке для начальной школы разрабатывались М. Б. Горбуновой, В. В. Ковaливом и А. Ю. Ковалив, Э. А. Жерко, Н. Н. Грачёвой, Н. Г. Бондаренко, Е. Г. Гуляевой. В данной статье мы подробнее остановимся на рабочих тетрадях авторов В. В. Ковалив, А. Ю. Ковалив, созданных для 1 и 2 классов. Рассматриваемые тетради представляют собой пособия для учащихся учреждений общего среднего образования с русским языком обучения и выходят в издательстве «Адукацыя і выхаванне». Впервые эти пособия появились в распоряжении учителей и учащихся в 2017 и 2018 годах (соответственно) и к настоящему времени выдержали уже три издания каждое.